## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Танец TikTok как феномен современной танцевальной культуры [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/tanets-tiktok-kak-fenomen-sovremennoy-tantsevalnoy-kultury/viewer – Дата доступа: 2.03.2024.

2. Challenge в ТикТок. Что это и как работает? – подробности и примеры [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://vc.ru/u/607046-nostra-telegram/220449-chellendzhi-v-tiktok-chto-eto-i-kak-rabotaet-podrobnosti-i-primery – Дата доступа: 3.03.2024.

3. Medialeaks [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://medialeaks.ru/2510tat-str-int-slickback/ – Дата доступа: 3.03.2024.

4. Medialeaks [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://medialeaks.ru/2206tat-trnd-gta / – Дата доступа: 3.03.2024.

Буракова А. Д., магістрант
дзённай формы навучання
Навуковы кіраўнік – Сакалова В. М.,
кандыдат культуралогіі, дацэнт

# СІМВАЛІЧНАЯ ПРАСТОРА ГОРАДА І МЕТАДЫ ЯЕ ДАСЛЕДАВАННЯ

Для сучаснага навуковага дыскурса праблема феномена горада з’яўляецца асабліва папулярнай, улічваючы сённяшнія тэндэнцыі ўрбанізацыі. Архітэктурная прастора гарадоў хутка змяняецца. З’яўляюцца новыя архітэктурныя сімвалы, а сэнсы старых

пераўтвароўваюцца. Пагэтаму мноства навук звярнулі ўвагу на дадзены феномен. Да іх ліку адносяцца сацыялогія, геаграфія, культурная антрапалогія, урбаністыка і г. д. Звычайна навукоўцы разглядаюць паняцце горада, яго сутнасць, структуру, функцыі. Раней даследчыкі не звярталі ўвагу на сімвалізм горада, але зараз можно адзначыць імкнененне да міждысціплінарнага падыходу да даследавання горада. Разгледзім, як гэтыя навукі разумелі, што такое горад і яго сімвалічная прастора.

Адным з піянераў сацыялогіі ў даследаванні горада з'яўляецца Макс Вебер з працай “Горад”. У самым пачатку кнігі Вебер адзначае, што па сваім характары азначэнні паняцця “горад” могут быць самымі markednymi розными, але з сацыялагічнага пункту гледжання “горад – гэта замкнёнае паселішча, будынкі якога цесна прымыкаюць адзін да аднаго, і якое настолькі вялікае, што асабістае знаёмства суседзяў адсутнічае” [1, с. 9]. Кніга “Горад” пра тое, якім чынам узнікае горад як сацыяльны інстытут. Аўтар адным з першых спрабуе зразумець, як на скрыжаванні эканамічных, ваенных і палітычных функцый фарміруецца горад, якія рысы характэрны для рознага тыпу гарадоў. Таксама з пункту гледжання сацыялогіі горад разглядала Чыкагская сацыялагічная школа. Яе прадстаўнікі лічылі, што месцазнаходжанне горада і іншыя фізічныя рысы ўплываюць на стратыфікацыйную структуру грамадства [5, с. 89].

Культуралогія разглядае горад як прастору, насычаную культурнымі сэнсамі. Напрыклад, Кевін Лінч у працы “Вобраз горада” ўводзіць паняцце “вобраз горада” і вылучае яго прадметныя формы: шляхі, межы, раёны, вузлы і арыенціры. Гэтыя элементы маюць універсальны характар, так як яны праяўляюцца ў мностве тыпаў вобраза акружэння [3, с. 51]. Другімі словамі, ствараюць сімвалічную прастору горада.

У рамках семіятычнага падыходу горад разглядаецца як знакавая сістэма, дзе горад – носьбіт і транслятар культурнай інфармацыі. Адным з першых даследчыкаў горада як знакавай сістэмы стаў Ю. Лотман, які прапанаваў успрымаць горад, як складаны семіятычны механізм, генератар культуры, сістэму тэкстаў і кодаў, які належыць розным мовам і ўзроўням [4, с. 453].

Такім чынам, сімвалічная прастора горада – гэта культуры тэкст, які ствараецца гаражанамі ў працэсе іх узаемадзеяння з матэрыяльнай гарадской прасторай. Гэта значыць у працэсе стварэння і прачытання гарадскіх сімвалаў. Гарадскі сімвал – гэта культурны артэфакт, якому гараджане надаюць сэнс, які не связаны з яго сутнасцю. Прафесар Лейдэнскага ўніверсітэта Peter J. M. Nas вылучае чатыры тыпы сімвалаў: матэрыльныя, дыскурсіўныя, іканічныя, паводзінскія, а таксама аднайменныя напрамкі сімвалізму [7, р. 9–15]. Да матэрыяльных сімвалаў належаць будынкі, якія ў сваёй сукупнасці складаюць сістэму арыенціраў у горадзе. Дыскурсіўныя сімвалы адлюстроўваюць гарадскія вобразы і ўяўляюць сабой нейкія вербальныя тэксты. Іканічныя сімвалы ўяўляюць сабой яскравых асоб ці групы людзей, звязаных з гэтым горадам. Да паводніцкіх сімвалаў адносяць рытуалы, масавыя святы, дзеянні, фестывалі.

У рамках матэрыяльнага сімвалізму, горад разглядаецца даследчыкамі як матэрыяльны аб’ект, які складаецца з архітэктурных і інфраструктурных элементаў. Навукоўцы вывучаюць будынкі, помнікі і іншае матэрыяльнае напаўненне прасторы вуліц. Даследаванні сканцэнтраваны не толькі на асобных аб’ектах гарадскога асяроддзя, але і на аналізе іх узаемадзеяння з агульнай прасторай горада. Асяроддзевы падыход да аналізу гарадской прасторы, распрацаваны прадстаўнікамі Чыкагскай школы сацыялогіі і апісаны Д. В. Кісляковай дазваляе

разглядаць сацыякультурную прастору горада як з’яву, якая змяняецца ў часе і ўзаемазлучана са зменамі прасторавы горада [2]. R.-A. Vermeer [8] і J. Luo [6] разглядаюць як гістарычныя, так і новыя архітэктурныя збудаванні з пункту гледжання іх узаемадзеяння з прыроднымі ландшафтамі і лініяй гарызонту. Даследаванне матэрыяльнага сімвалізму таксама ўключае аналіз фота- і відэакантэнту, які адлюстроўвае фізічныя элементы гарадскога асяроддзя праз перспектыву стваральніка.

У кантэксце дыскурсіўнага сімвалізму ўвага надаецца аналізу вербальных, а не візуальных сімвалаў горада. Гэта могуць быць тапонімы ці мастацкія творы. Таксама аналізуюцца гарадскія інтэрнэт-рэсурсы, дзе метад кантэнт-аналізу аказваецца асабліва эфектыўным. Напрыклад, R.-A. Vermeer выкарыстоўваў маркетынгавы падыход для аналізу вэб-сайта горада Гент [8].

У кантэксце паводніцкага сімвалізму даследаванні факусіруюцца на вывучэнні рытуалаў, свят, грамадскіх мерапрыемстваў і іншых рэгулярных і структураваных формах паводзін. Гэтыя аспекты аналізуюцца праз фота- і відэаматэрыялы, якія дэманструюць сувязь паміж сімвалічнымі аспектамі горада і паводніцкімі патэрнамі яго жыхароў. Таксама прымяняецца метад ментальнага карціравання для выяўлення характэрных асаблівасцей паводзін у гарадскім асяроддзі, грунтуючыся на знешніх праявах і характарыстыках. Гэты метад дапамагае выявіць сувязі паміж рознымі з’явамі ўнутры горада.

У галіне іканічнага сімвалізму даследчыкі факусіруюцца на ключавых фігурах, якія маюць асаблівае значэнне для горада. Гэты падыход прадугледжвае ўсебаковы аналіз гарадскога асяроддзя, таму што іканічныя сімвалы звычайна ўзаемазлучаныя з іншымі тыпамі сімвалаў.

Таксама выдзяляецца напрамак эмацыянальнага сімвалізму, які накіраваны на вывучэнне эмацыйнага склада гарадскіх сімвалаў і іх ўспрымання [7, p. 17]. Такія знакі могуць адлюстроўваць розныя пачуцці, напрыклад, адчуванні камфорту ці дыскамфорту, бяспекі ці небяспекі, прывабнасці ці непрывабнасці, у стаўленні да розных аб’ектаў горада. У рамках гэтага падыходу часта выкарыстоўваюцца ментальныя карты, створаныя на аснове апісанняў рэспандэнтаў. Метад go-along – сумеснае перамяшчэнне даследчыка і ўдзельніка па гарадской прасторы. У працэсе такога перамяшчэння ажыццяўляецца назіранне за рэакцыямі ўдзельніка на розныя гарадскія аб’екты, вызначаюцца асацыяцыі, якія выклікаюцца гэтымі аб’ектамі.

У даследаваннях сімвалізму горада таксама прымяняюцца ўніверсальныя метады, якія могуць выкарыстоўвацца незалежна ад тыпу аналізаваных сімвалаў. Найбольш распаўсюджанымі з’яўляюцца анкетаванне і сацыялагічныя апытанні, якія ўключаюць распрацоўку анкет і іх наступнае распаўсюджванне сярод рэспандэнтаў, як асабіста, так і праз інтэрнет. Часта ў апытаннях выкарыстоўваюцца фатаграфіі для атрымання глыбейшых адказаў. Інтэрв’ю патрабуе непасрэдных зносін даследчыка з рэспандэнтам, што дазваляе назіраць за іх рэакцыямі ў рэальным часе, што асабліва каштоўна пры вывучэнні эмацыйных аспектаў знакаў. Аўтаэтнаграфія – гэта метад, пры якім даследчык фіксуе свае перамяшчэння па горадзе і ўспрыманне яго сімвалічнай прасторы, дзейнічаючы як назіральнік і ўдзельнік культурнага кантэксту адначасова. Гэта патрабуе ад даследчыка здольнасці да самааналізу і рэфлексіі, каб аб’ектыўна ацаніць свае ўражанні.

Такім чынам, вывучэнне сімвалічнай прасторы горада і яе ўплыў на гарадскую культуру падкрэслівае неабходнасць міждысцыплінарнага падыходу і даследаванняў у гэтай галіне.

## СПІС ВЫКАРАСТЫНЫХ КРЫНІЦ

1. Вебер, М. Город / М. Вебер. – М. : StrelkaPress, 2017. – 252 с.
2. Кислякова, Д. В. Символическое пространство современного города: культурные традиции и инновации в конструировании имиджа : на примере Ростова-на-Дону : автореф. дис. ... канд. социолог. наук : 22.00.06 / Д. В. Кислякова ; Адыг. гос. ун-т. – Майкоп, 2011. – 27 с.
3. Линч, К. Образ города / К. Линч. – М. : Стройнздат, 1982. – 328 с.
4. Лотман, Ю. М. Семиосфера / Ю. Лотман. – СПб. : Искуссство-СПб, 2000. – 704 с.
5. Луков, В. А. Чикагская социологическая школа: начало качественной стратегии в эмпирической социологии / В. А. Луков, Д. А. Тихомиров // Горизонты гуманитарного знания. – 2019. – № 1. – С. 89–107.
6. Luo, J. Imagining Modernity: Memory, Space and Symbolism of The Hague /J. Luo // Cities Full of Symbols: A Theory of Urban Space and Culture. – Leiden University Press, 2011. – P. 173–186.
7. Nas, Peter J. M. Cities Full of Symbols: A Theory of Urban Space and Culture / P. J. M. Nas. – Leiden University Press, 2011. – 305 p.
8. Vermeer, R.-A. Squares, Water and Historic Buildings: The Transforming Power of City Marketing on Urban Symbolism in Ghent, Belgium / R.-A. Vermeer // Leiden University Press, 2011. – P. 55–84.